**Заданні да конкурсу “Скарбы мовы”**
**30.11.2023**
**Тэма: “Фанетыка. Арфаэпія”**

**Заданне 1.**
**Выберыце правільны адказ/адказы з прапанаваных.**

**1. Акрамя гукаў фанетыка вывучае...**
А. Націск;
Б. Словаўтварэнне;
В. Прыназоўнікі і злучнікі;
Г. Графіку.

**2. У якім/якіх з гэтых слоў ёсць мяккі гук [*ц’*]?**
А Малацьба;
Б. Мядзведзь;
В. Цыклоп;
Г. Авадзень.

**3. У якім слове/словах сустракаецца гук [*ш*]?**
А. Перапісчык;
Б. Зжаць;
В. Смяешся;
Г. Сцяжынка.

**4. У якім слове/словах колькасць гукаў і літар супадае?**
А. Дождж;
Б. Масіў;
В. Сям’я;
Г. Дзічка.

**5. У якой пары/парах правільна перададзены фанетычныя асаблівасці слова?**
А. Носьбіт – [нос’б’іт];
Б. Грузчык – [грусчык];
В. Сцелюць – [с’ц’элюць];
Г. Счарнець – [шчарн’эц’].

**6. Уякім слове/словах колькасць гукаў і літар не супадае?**
А. Воля;
Б. Вугаль;
В. Люблю;
Г. Мільярд.

**7. У якім/якіх з гэтых слоў 6 гукаў?**
А. Дзядуля;
Б. Лебедзь;
В. Дзівак;
Г. Дзьмуць.

**8. Якія пары слоў утрымліваюць аднолькавыя па сваіх уласцівасцях зычныя гукі?**
А. Сад – сядзь;
Б. Ліса – сіла;
В. Кот – код;
Г. Сын – сінь.

**9. Калі пералічаныя словы змяніць такім чынам, каб *-ё-* было не пад націскам, у якім з іх пераходу *-ё-* ў *-я-* не будзе?**
А. Цёплы;
Б. Спёка;
В. Манцёр;
Г. Клён.

**10. Правілы арфаэпіі – гэта правілы …?**
А. Пабудовы словазлучэнняў;
Б. Перадачы гукаў на пісьме;
В. Пераносу слоў;
Г. Вымаўлення гукаў, іх спалучэнняў.

**Заданне 2**

**Зрабіце пераклад слоў і выразаў з рускай мовы на беларускую і затранскрыбіруйце іх.**
***Напрыклад:***
По веткам без шума зашмыгали воробьи ⟹ Па галінах без шуму зашмыгалі вераб’і ⟹ [па̂гал’і́нах б’аш̂шу́му зашмы́гал’і в’эрабі́й]

| Словы/выразы | Пераклад на беларускую мову | Транскрыпцыя |
|---|---|---|
| 1. Смеешься | | |
| 2. На печи | | |
| 3. Мёд сладкий в кадушке | | |
| 4. Секции вольной борьбы и футбола | | |
| 5. Маленький мизинец | | |
| 6. Изредка икать | | |
| 7. Отшумел митинг | | |
| 8. На дорожке крапива | | |

## Заданне 3

**Выканайце заданні**

1. Адкажыце, “так” ці “не”:

А. Галосны ***-э-*** не пад націскам пераходзіць у ***-е-.***

Б. Мяккасць зычных на пісьме абазначаецца з дапамогай толькі мяккага знака*.)*

В У вымаўленні санорных гукаў удзельнічае шум і голас.

Г. Пры вымаўленні глухіх зычных чуецца толькі шум.

2. Вызначце, якія атрымаюцца словы ў наступных умовах і запішыце іх.

А. У слове ***бар*** першы зычны вымавіць як парны глухі.

Б. У слове ***боль*** першы зычны замяніць санорным зычным.

В. У слове ***дуб*** першы зычны вымавіць як свісцячы.

Усе словы пасля зменаў павінны мець сэнс.

3. Адгадайце загадкі:

А. На беразе марскім
Заўсёды я валяюся,
А выкінь мяккі знак –
Увысь птушкай узвіваюся.

Б. Калі я з **г** – жыхар крылаты,
Заўжды ў паветры лётаю.
Без **г** – бяскрылы, хоць хвастаты,
Жыву ў рацэ з ахвотаю.

В. Яна да мора цягнецца заўжды,
Бяжыць, віляючы, управа, улева…
Ледзь перастаў склады – і вось тады
Адразу стане часткай дрэва.\

4. Выпішыце словы, у якіх побач знаходзяцца два галосныя гукі.
*Маёр, лаўрэат, аазіс, саюзнікі, каланіяльны, вераб'іны, рытуал, Клеапатра, піяніна,* іанізацыя*, баец, серыял, тэарэма.*

5.Пералічыце фанетычныя законы беларускай мовы і прывядзіце прыклад да кожнага з іх.

## Заданне 4

**Адзначце словы з пэўнай фанетычнай асаблівасцю ў прыведзеных ўрыўках з вершаў Уладзіміра Караткевіча.**
\

1. **Зацвярдзелыя зычныя**

Дробненькі дождж ык
Скача ля тына,
Дзе чырванее
Дзеўка-шыпшына.

Сонца-шыпшына,
Дай абдыму я,
Лапкі-пялёсткі
Табе пацалую.

Калі памру я,
Згіну са свету,
Дай на тым свеце,
Што і на гэтым.

Не алілую,
Не ладан Божы:
А каля тына
Дзікую ружу.

Край наш пакутны,
Край наш дзівосны,
Дожджык, азёры,
Гордыя сосны.

**2. Пераход *-э-, -о-* у *-а-, -е-, -ё-* у *-я-***

Над намі не будзе бога,
За намі - пажараў дым.
Мы не просім нічога,
Мы просім цябе аб адным:
У нас ні жонкі, ні хаты,
Ні дзяўчын, ні ніў, ні каня.
Дай, разграміўшы праклятых,
Смерць на полі прыняць.
Не нам каханых палацы,
Нам - абдоймы ночы пустой.
Нам немагчыма вяртацца.
Нас не сустрэне ніхто.
Няхай і кроку ў тумане
Не зробіць дахаты нага.
Не там, а з намі каханне,
На нашых гнеўных сцягах.

**3. Мяккія гукі [з’][с’]**

Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Ты — наш край. Ты — чырвоная груша над дзедаўскім домам,

Лістападаўскіх знічак густых фасфарычная раць,
Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому
Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць.

**Заданне 5**

**Праслухайце аўдыязапіс, знайдзіце памылкі ў вымаўленні і запішыце іх.**